УДК 821.161.3 – 32.09

**М. М. Воінава-Страха** (Мінск)

# АНТАЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў НАВЕЛІСТЫЦЫ АЛЕНЫ БРАВА

Проза Алены Брава даўно з'яўляецца аб'ектам пільнай увагі літаратуразнаўцаў і крытыкаў. Даволі часта ў фокусе ўвагі даследчыкаў аказваецца "жаночы" аспект творчасці пісьменніцы. Гендарная скіраванасць – цалкам натуральная з'ява ў мастацкай прасторы XXI стагоддзя, бо пры ўсёй дынаміцы і "асучасніванні" свядомасці грамадства безліч жанчын працягваюць жыць "у патрыярхальным дыскурсе і цярпліва прымаюць яго жорсткія ўмовы – поўнае самаадрачэнне дзеля блізкіх. <…> Свет насамрэч трымаецца на іх непражытых жыццях, прынесеных у ахвяру здольнасцях, нязведаных радасцях" [3].

Тым не менш аналіз шэрагу тэкстаў А. Брава дазваляе адзначыць, што яе малая проза выходзіць за рамкі чыста гендарнай праблематыкі. У навелістыцы аўтара прасочваецца выразны акцэнт на асэнсаванні самой сутнасці чалавечай экзістэнцыі. Паказваючы самыя розныя аспекты быцця гераінь, пісьменніца з усім майстэрствам псіхалагічнага аналізу раскрывае глыбіню праблем, звязаных з іх асобаснай самаідэнтыфікацыяй і самарэалізацыяй.

Так, у няспынных пошуках сваёй існасці знаходзіцца гераіня навелы "Ясным утром в Пинар-дель-Рио". Трывалай асновай яе існавання з'яўляецца ўсепаглынальная любоў да сына і каханне да мужчыны, які, не будучы яе мужам, стаў без перабольшання адзіным сімвалам на вырataванне яе душы, моцна скаванай сацыяльна абумоўленымі ланцугамі. Акрэсленая сітуацыя выразна парадаксальная па сваім змесце. З аднаго боку, каханне – універсальная аксіялагічная катэгорыя і, здавалася б, яе дамінуючае становішча ў асабістай экзістэнцыйнай сістэме вылучаецца гарманічным характарам. З іншага боку, гэта каханне супярэчыць хрысціянскім нормам маралі, бо навідавоку парушэнне адной з дзесяці біблейскіх запаведзяў.

Дадзеная акалічнасць дэстабілізуе псіхаэмацыянальны стан гераіні і прыводзіць яе ў стан татальнага душэўнага разладу. Непрымальна варожым здаецца ўсё: нелюбімы муж, сувязь з якім пераўтварылася ў невыноснае бярэмя, яго сваякі, вымушаны кантакт з якімі настолькі абцяжарвае, што сямейнае жыццё нагадвае хутчэй тэатралізаванае прадстаўленне, грамадскі лад вакол у цэлым, існаванне згодна з парадкамі якога выклікае толькі сорам і непераадольнае супраціўленне.

Першапрычына вынікае з кантэксту навелы: немагчыма пабудаваць зладжаную сувязь на фундаменце, створаным з ілжы, якая "как гниющая слизь мертвого моллюска в перламутровой раковине… Раковина-гроб, вместилище смердящей плоти" [2, с. 321]. Адносіны, створаныя на аснове кахання, валодаюць жыццесварaльнай сілай. Калі ж адзінае, чым яны падмацоўваюцца, – гэта цярпенне і маўклівае выкананне абавязкаў, разбуральная сіла імкліва нарастае, не пакідаючы кампрамісных варыянтаў, бо толькі "любовь превращает обыкновенное в прекрасное, а не наоборот" [2, с. 322].

Калі сэнсаўтваральным стрыжнем свайго жыцця гераіня навелістычнага апавядання “Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца” выбрала сына, такім чынам рэалізуючы толькі адну са сваіх іпастасей – маці, то ў гераіні “Ясным утром в Пинар-дель-Рио” прасочваецца відавочная тэндэнцыя да самаідэнтыфікацыі сябе як жанчыны. Хвароба сына Ігната дадае цёмных фарбаў у яе мацярынскія будні, але не перашкаджае прабівацца няхай кволаму, але патэнцыяльна выратавальнаму агню кахання.

Паколькі першапачаткова ў быційную аснову памылкова закладзены катэгорыі, якія супярэчаць аксіялагічнаму кодэксу, працэс жаночай самаідэнтыфікацыі застаецца незавершаным і, як вынік, гераіня пераўтвараецца ў “заживо погребенную наложницу мертвого фараона” [2, с. 309]. Напаткаўшая смерць аб’екта кахання гераіні не пакідае шанца для вызвалення з замкнёнага кола быцця і далейшай асобаснай самарэалізацыі.

Навелістычная парадаксальнасць, дамінантнае ядро якой утварае антытэтычнасць загалоўка (“Ясным утром в Пинар-дель-Рио”) і фінальнага сегмента твора (смерць доктара), – сэнсаўтваральная ў кантэксце дадзенай навелы. Змест быційнай сістэмы іманентна разбуральны па сваім характары, калі яго ключавыя складнікі выходзяць за рамкі спрадвечных законаў універсуму.

Анталагічная карціна ў навелістычным апавяданні “Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца” адрозная па сваёй сутнасці. Прыярытэт у быційнай аснове галоўнай гераіні складае гіпертрафіраваны клопат пра сына. Падобная празмерная трывожнасць і падпарадкаванне сэнсу ўласнага жыцця турботам пра дзіця можа выклікаць асуджэнне і нават абурэнне ў выхаванага ў феміісцкім духу чытача, але ніяк не супярэчыць маральна-этычным асновам быцця ў цэлым і хрысціянскім пастулатам у прыватнасці. Па сутнасці, гэта справа ўласнага выбару кожнага чалавека. Парадаксальным жа з’яўляецца той факт, што працэс самаразбурэння непазбежны і ў дадзеным выпадку.

Першапрычына, згодна з разважаннямі гераіні, крыецца ў тым, што чалавек, “як і любая матэрыяльная *“сістэма”*, <…> схільны да самаразбурэння, і, відавочна, тым у большай ступені, чым больш у ім уласна чалавечага...” [1, с. 69]. Меркаванне галоўнай гераіні выразна супярэчлівае і адначасова экзістэнцыяльнальнае па сваёй сутнасці, пра што сведчыць адсылка і да абсурднасці свету, і да адчужанасці ў ім адзінокай асобы: “Цяпер вам, нарэшце, зразумела, дзеці, чаму СУМЛЕННЕ, СПАГАДА і... правільна, ЛЮБОЎ! – абмяжоўваюць нашыя шанцы на выжыванне? Затое ўсё груба-таўстаскурае і прымітыўнае мае зайздросную энтрапію і, адпаведна, бесклапотнае існаванне – язык не паварочваецца назваць гэта жыццём, зрэшты, у духоўным плане гэта ўжо і не жыццё, а амаль што стан неарганічнай матэрыі. Бо чалавек у Сусвеце вызначаецца менавіта любоўю і схільнасцю да самаахвярнасці...” [1, с. 69].

Выбар, зроблены галоўнай гераіняй, дазваляе меркаваць аб сталасці яе свядомасці і шырыні светапогляду. Усведамленне прыярытэту здароўя ўнучкі над уласным – не абясцэньванне каштоўнасці свайго жыцця, а разуменне важнасці працягу роду як неад’емнага складніка сусвету. Гэта можна ў пэўнай ступені разглядаць як эгаізм, але не ў прымітыўнай, а самадастаковай яго форме.

Гераіні навел А. Брава настолькі прызвычайваюцца да вымушанай залежнасці, што атрыманая свабода замест палёгкі становіцца нечым “самым цяжкім у жыцці”, “как будто провалилась в пустоту” [2, с. 354]. Нялёгкая праца і падпарадкаванне волі мужа ўспрымаецца гераіняй твора “Homo vitreus” з удзячнасцю,

свядома лічыцца праявай “вышэйшай волі” і нават “боскай ласкай”, бо ёй дадзена магчымасць прайсці “выхаванне душы” не праз строгія правілы манастырскага статута, а ў свецкім жыцці атрымаць той жа вопыт [2, с. 355].

З нашага пункту гледжання, з кантэксту твора “Homo vitreus” вынікае не тыповая гендарная праблема абмежавання жаночых правоў у патрыярхальным свеце. Гераіня сапраўды выбудоўвае свой жыццёвы шлях, абапіраючыся на вопыт чалавека, які стаў для яе і мужам, і бацькам, і дзіцем адначасова [2, с. 355]. Але пунктам адліку ў падобнай быційнай сістэме з’яўляецца не страх ці прыгнечаная жаночая воля, а ўсведамленне значнасці “місіі” яе мужа, які пабудаваў храм сваімі рукамі не з эгаістычных меркаванняў ці сляпой веры. Яго памкненні накіраваны на тое, каб хоць б часткова гарманізаваць навакольны свет: “и блоки таскал, и рубероид стелил, и кресты устанавливал вокруг деревни, чтобы самоубийства в ней прекратились… Руками Миши сделаны лампадки из цветного стекла, что перед иконами висят” [2, с. 356]. І нават “шкляная хвароба” – гэта праява неўтаймаванага жадання напоўніць хараством і радасцю чалавечае быццё.

Такім чынам, у аснове самаўспрыняцця гераіні тэксту “Homo vitreus” – складаны працэс пошуку прызначэння не з уласна пазіцыі жанчыны, а зыходзячы першапачаткова з чалавечай сваёй сутнасці: “я” – неад’емны суб’ект Сусвету, стварэнне прыроды ў цэлым, безадносна да вызначанай гендарнай ролі.

З аналізу навел А. Брава заканамерна выступае пытанне аб першавытоках немагчымасці спынення працэсу самаразбурэння (у творы “Ясным утром в Пинар-дель-Рио” – на духоўна-маральным і псіхаэмацыянальным узроўнях, у тэксце “Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца” – на фізічным з прычыны невылечнасці хваробы гераіні). Дамінуючым матывам у акрэсленым рэчышчы з’яўляецца страх, які і выступае звышпрычынай, што блакіруе патэнцыяльныя ўнутраныя рэзервы для пераадолення перашкод і далейшага асобаснага развіцця: “Страх заставляет проживать фальшивую жизнь, жизнь-имитацию, в то время как моя единственная-неповторимая ковыляет следом, точно выброшенная на улицу собака, – лапа перебита, шерсть в колтунах, но тащится за хозяином: а вдруг позовет? Страх запускает щупальца в сердцевину сердца и высасывает оттуда силу” [2, с. 344].

У навелістычным апавяданні “Крупнік для музы” гераіня канкрэтызуе характар гэтага страху – любоў да дзяцей. З кантэксту твора “Ясным утром в Пинар-дель-Рио” таксама вынікае, што менавіта страх за здароўе сына выступае ў якасці аднаго са стрымліваючых фактараў у працэсе асобаснай самаідэнтыфікацыі. Расстаноўка прыярытэтаў на карысць дабрабыту дзяцей вымушае жанчын вышэйзгаданых навел зрабіць крок назад ва ўласным развіцці і самарэалізацыі.

Сэнсаўтваральны цэнтр быційных формул Валянціны Валовіч (“Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца”) і Раісы (“Сон пионерки”) складае сям’я ў асобе іх сыноў. Аднак наколькі падобнай здаецца жыццёвая пазіцыя абедзвюх гераінь, настолькі дыферэнцыйным з’яўляецца аксіялагічны падмурак іх экзістэнцыі.

Не будучы распешчанай раскошай у дзяцінстве, Раіса сканцэнтравалася на кампенсаванні матэрыяльнага дабрабыту ў жыцці Васіля, свайго сына, чакаючы пры гэтым ад яго, здавалася б, заканамернай удзячнасці, бо, згодна з меркаваннямі гераіні, “за любовь по справедливости полагалась награда” [2, с. 327]. Засяродзіўшыся на стварэнні ўсебакова камфортных умоў для Васіля, Раіса настолькі захапілася гэтым працэсам, што з цягам часу мяшчанскія памкненні

пераўтварыліся спачатку ў стыль жыцця, а потым сфармавалі і адпаведны лад мыслення. Бясспрэчна, "не земляничное мороженое" [2, с. 327] былі гэтыя гады жыцця: цяжкая гандлярская праца істотна адбілася на яе здароўі, але дазволіла забяспечыць максімальны дабрабыт для Васіля.

Навелістычная парадаксальнасць у дадзеным творы заключаецца ў тым, што ні "тонкая наука обхождения с нужными людьми" [2, с. 324], ні бездакорная вера ва ўсемагутнасць грошай не дапамаглі ў кульмінацыйны момант, калі сын апынуўся ў сітуацыі на мяжы жыцця і смерці. Звыклыя метады вырашэння праблем пацвердзілі сваю бессэнсоўнасць: "мозг Василя умирал, клеточка за клеточкой, и ничем необратимость смерти было остановить, сколько и кому ни давай на лапу" [2, с. 325].

Смерць сына стала лакмусавай паперай зместу яе жыцця. Паклаўшы пасля пахавання перад сабой чысты аркуш паперы, Раіса, "полная злой решимости заклеймить и покарать", нечакана "остолбенела от внезапной мысли, даже ручку выронила: теперь ее жизнь – как этот чистый лист" [2, с. 326]. Гэта раптоўнае адкрыццё спрыяла глыбокай рэфлексіі над сваім лёсам: відавочнай стала і падмена жаццестваральных сэнсаў, і маральна-этычных каштоўнасцей, і анталагічных складнікаў у цэлым. Выяўленая ілюзорнасць мар і надзей прымусіла звярнуцца не толькі да перагляду пройдзенага шляху, але і да аналізу ўласнага прызначэння: "После сына остался рисунок. После его отца останется гобелен в далеком южном дворце. А после нее, Раисы, – что? Биде с блестящим краном? Так зачем же все это было…" [2, с. 331].

Свядомая падмена жыццяў – свайго і сына – адбылася і ў Валянціны ("Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца"), якая, тым не менш, зрабіла крок наперад у асобасным развіцці і засяродзілася не на забеспячэнні матэрыяльнага дабрабыту, а пошуку ісціны, схаваных сэнсаў быцця. Засмучаная і разгубленая з прычыны дэфармацыі спрадвечных маральных прынцыпаў, Валянціна прыходзіць да высновы, што «ад слоў "СУМЛЕННЕ", "СПАГАДА", "ЛЮБОЎ" засталіся толькі "выпатрашаныя абалонкі" [1, с. 68]. Працэс усеагульнай энтрапіі непазбежны: "Калі чалавек ідзе насуперак усеагульнаму аскаціньванню, прыходзіць смерць са сваім старажытным інструментам. Так, смерць падпарадкоўваетакі адшчапенца ўсеагульнаму закону, бо прах, у рэшце рэшт, мае максімальную энтрапію" [1, с. 70].

У той час як Валянціна ("Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца") засяродзілася на ўнутраным тэарэтычным асэнсаванні дэфармаваных асноў быцця, гераіня навелістычнага апавядання "Крупник для музы" паглыбілася значна далей у анталагічныя пошукі. Усведамленне сваёй неаспрэчнай адказнасці перад дачкой і маці перапоўнена трагічнай ірoніяй, бо любоў да іх "давно превратила кровь в вязкую желеобразную массу" [2, с. 350]. Нягледзячы на праяўленне максімальнай цярпімасці і такту, яна, тым не менш, дэманструе настойлівую рашучасць ва ўстанаўленні асобасных межаў і абароне індывідуальнай прасторы, бо як сумна канстатуе сама гераіня, "надо до крови сражаться, чтобы защитить от других хоть частицу себя" [2, с. 350].

Важна акрэсліць, што ў дадзеным выпадку гэта не тыповая праява феміністкай ідэалогіі, а ўсвядомлены працэс пошуку сваёй самасці. Захопленая працэсам творчасці, яна спрабуе знайсці ў жыцці хоць нейкую апору для самаідэнтыфікацыі. Такой матывацыйнай кропкай з'яўляецца пачак змятых лістоў, напісаных самой гераіняй, але яшчэ ў далёкім мінулым. Не толькі часавая адлегласць, але бяздонне няспраўджаных планаў і памкненняў вымушаюць гераіню

гаварыць пра тую маладую жанчыну ў трэцяй асобе, быццам абстрагаваўшыся ад яе. Тая дзяўчына вылучаецца кардынальна рашучай жаццёвай пазіцыяй, яна самадастатковая, валявая, цвёрда ўпэўненая: “единственное, что ты можешь изменить, это твоя собственная жизнь, неумолимо короткая” [2, с. 351]. Менавіта з гэтай прычыны абсалютна бессэнсоўна “играть нелепые роли, ссориться, вести с умным видом пустые разговоры, <…> волноваться из-за событий, что происходят неизвестно где…” [2, с. 351].

Анталагічная пазіцыя гераіні выступае своеасаблівай квінтэсэнцыяй пошукаў жанчын, адлюстраваных у іншых навелістычных тэкстах А. Брава. Не філасофска-тэарэтычныя развагі адносна маральна-этычных прынцыпаў быцця запаўняюць яе свядомасць, бо пры ўсёй значнасці яны вылучаюцца безасобасна-адцягненым характарам. Галоўным жа вынікам у працэсе самаідэнтыфікацыі павінна быць спазнанне сябе як унікальна-індывідуальнай часткі Сусвету. Дасягнуць такога стану магчыма праз адчуванне быцця “тут і цяпер”, праз спасціжэнне “поўнай прысутнасці”, а не яго імітацыі [2, с. 352].

Такім чынам, агульнаключавым матывам анталагічнай праблематыкі ў вышэйразгледжаных навелістычных тэкстах Алены Брава з’яўляецца страта або моцная дэфармацыя індывідуальна-асобаснай асновы экзістэнцыі з прычыны сацыяльна абумоўленых фактараў. Актуальныя рэаліі сучаснасці сфармавалі прыдатныя ўмовы для паўнавартаснага жаночага асобаснага самавызначэння і самарэалізацыі без прывязкі да гендарных стэрэатыпаў. Важным складнікам гэтых працэсаў з’яўляецца самаідэнтыфікацыя асобы не праз прызму іншых суб’ектаў і з’яў рэчаіснасці, а праз фіксацыю свайго быцця “тут і цяпер”, у канкрэтны часавы адрэзак рэчаінасці, бо, як вынікае з кантэксту прааналізаваных твораў, імітацыя прысутнасці, “падмена” жыццяў і аксіялагічных прынцыпаў суправаджаецца нівеліраваннем асобаснага “я” і выступае каталізатарам псіхаэмацыянальнага і фізічнага самаразбурэння. Пошук сябе можа мець станоўчы вынік, калі пунктам адліку выступае першаснае “я”, пазбаўленае знешніх наслаенняў, утвораных шляхам вымушанай адаптацыі да навакольнага свету.

ЛІТАРАТУРА

1. *Брава, А.* Каменданцкі час для ластавак [Электронны рэсурс] / А. Брава. – Мінск. : Маст. літ., 2004. – 183 с. – Рэжым доступу : https://www.rulit.me/books/kamendancki-chas-dlya-lastavak-read-424513-67.html#section_7. – Дата доступу : 28.10.2020.

2. *Браво, А.* Имя Тени – Свет : повести, рассказы / А. Браво. – Минск. : Літаратура і мастацтва, 2012. – 356 с.

3. *Ракоўская, Л.* Хто крадзе веру, розум і волю : інтэрв’ю з пісьменніцай А. Брава [Электронны рэсурс] / Л. Ракоўская // Звязда. – 2014. – Рэжым доступу : http://zviazda.by/be/news/20140612/ 1402522439-hto-kradze-veru-rozum-i-volyu. – Дата доступу : 02.11.2020.